Источник: "Витебские вести" - 2019-02-05

# Верны шляху

**Канферэнц-зала абласной бібліятэкі імя Леніна прыняла ўдзельнікаў круглага стала «На шляхах нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння», прысвечанага 100-годдзю стварэння БССР. Прафесійныя гісторыкі падрабязна абмеркавалі важную для сучаснай Беларусі тэму. Аўдыторыя складалася з прадстаўнікоў старэйшага пакалення і моладзі.**

Прафесар ВДУ імя П. Машэрава Іван Мандрык адзначыў, што перадумовы стварэння БССР можна шукаць у далёкай старажытнасці. Але ў 1903 годзе РСДРП прыняла праграму па нацыянальным пытанні, у якой абвяшчалася, што кожны народ мае права на дзяржаўнае самавызначэнне. Калі бальшавікі прыйшлі да ўлады, то выканалі сваё абяцанне. Праўда, існавала дзве пазіцыі: сталінская – аўтанамізацыя і ленінская – саюз свабодных савецкіх сацыялістычных рэспублік. Неацэнную ролю ў стварэнні БССР адыгралі бальшавікі-беларусы, якія супрацьстаялі так званым абласнікам. Паводле Івана Мандрыка, сёння шмат аўтараў канцэнтруюць увагу на негатыўных момантах існавання БССР. Акцэнт робіцца на прымусовым характары савецкай сістэмы, сумнеўнасці яе перспектыў. У той жа час не заўважаюцца дасягненні ў матэрыяльнай вытворчасці і духоўным уздыме народа Беларусі. Такі метад не мае пад сабой навуковай асновы і не спрые ўстанаўленню ісціны. Прафесіянал павінен абапірацца на канцэпцыю цэласнасці і непадзельнасці гістарычнага працэсу, праводзіць глыбокі аналіз падзей з улікам агульных заканамернасцей, не забывацца на прынцыпы кананічнасці і патрыятычнасці.

Кандыдат гістарычных навук галоўны спецыяліст упраўлення культуры аблвыканкама Дзяніс Юрчак звярнуў увагу, што на пачатку XX ст. адбываліся надзвычай складаныя працэсы. На тэрыторыі Беларусі ішла Першая сусветная вайна, тут былі сканцэнтраваны войскі. У складзе выканкама Заходняй вобласці не было ніводнага ўраджэнца Беларусі. Паказальна, што першы Усебеларускі з'езд, які праходзіў у снежні 1917 года, актыўна падтрымліваўся і фінансаваўся бальшавікамі. Арганізацыяй яго займаўся наркамат па справах нацыянальнасцей, якім кіраваў Іосіф Сталін. Форум сабраў 1872 дэлегаты і з'яўляўся самым прадстаўнічым з усіх з'ездаў народаў былой Расійскай імперыі. З яго ў чымсьці пачыналіся і БНР, і БССР.

Загадчык кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П. Машэрава Анатоль Дулаў адзначыў, што працэс фарміравання беларускай нацыі ўступіў у актыўную фазу яшчэ ў другой палове XIX ст. і завяршыўся ў складзе БССР. Спачатку гаворка ішла пра аўтаномію, але савецкі ўрад на чале з Леніным пайшоў далей, бачачы імкненне эліт да нацыянальнага самавызначэння і зыходзячы з геапалітычных інтарэсаў. Дарэчы, удзельнікі круглага стала пагадзіліся, што пэўную ролю ў стварэнні БССР адыграла абвешчаная ў 1918-м БНР, шэраг дзеячаў якой стаялі блізка да бальшавікоў і былі гатовы да супрацоўніцтва. Анатоль Дулаў прывёў цытату прэм'ер-міністра БНР Антона Луцкевіча з дзённіка за 1 студзеня 1919 года. У запісе зафіксавана, што яго абрадавала вестка аб стварэнні БССР. Многія хацелі ехаць у Мінск і працаваць разам з бальшавікамі.

Прарэктар па выхаваўчай рабоце Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Віктар Хаданёнак падкрэсліў, што людзі, якія займаліся стварэннем БССР, тыя ж самыя Зміцер Жылуновіч і Аляксандр Чарвякоў, верылі ў лепшае, адстойвалі свае ідэі і перакананні. Увогуле, пытанні ўтварэння БНР і БССР трэба вывучаць не толькі колам гісторыкаў, але прыцягваць спецыялістаў, якія займаюцца псіхалогіяй мас, эканамістаў, юрыстаў. Мы павінны не старацца некага асудзіць, а зразумець іх лінію паводзін і на падставе гэтага прыйсці да нацыянальнага і дзяржаўнага кампрамісу.

Старшыня Віцебскага гарадскога савета ветэранаў Ларыса Аленская папрасіла гісторыкаў назваць самыя яркія этапы існавання БССР. Дацэнт Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Трацццяк звярнуў увагу на 1920-я, калі вялося нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва, рэспубліка стала заснавальніцай СССР і ўз'ядналася з усходнімі тэрыторыямі. Таксама векапомны перыяд 1939 — 1945 гадоў: уз'яднанне з Заходняй Беларуссю, час вялікіх выпрабаванняў і Вялікай Перамогі ў вайне, пасля якой БССР стала заснавальніцай ААН і выйшла на міжнародную арэну. Канешне, важныя і 1970-я – залаты век БССР, калі рэспублікай кіраваў Пётр Машэраў. Іван Мандрык пагадзіўся з калегам і дадаў, што за савецкі час Беларусь з адсталай ускраіны ператварылася ў індустрыяльную краіну. Дзяніс Юрчак прывёў цікавую дэталь. Як вядома, у 1920-я ў СССР Новы год не адзначаўся, але ў БССР 1 студзеня быў святочным днём – Днём абвяшчэння рэспублікі. У Мінску ладзіўся вялікі парад. А на 10-годдзе БССР у 1929-м была адкрыта Нацыянальная акадэмія навук.

## ДАРЭЧЫ

**Па ініцыятыве старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Марзалюка хутка ва ўсіх ВНУ ўводзіцца абавязковы курс «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», на якім студэнты будуць вывучаць усе дзяржаўныя ўтварэнні, якія існавалі на тэрыторыі нашай краіны.**

Сяргей ЛЯШУК.

Сяргей Ляшук. Верны шлях